**Назва музея:** Музей “Аршаншчына літаратурная”

**Назва ўстановы адукацыі:** Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г.Барані”

**Адрас музея:** Віцебская вобласць, Аршанкі раён, г.Барань, вул.Уладзіміра Корбана, 8.

**Профіль (у дпаведнасці з Кодэксам):** комплексны (краязнаўчы)

**Сайт музея (указаць спасылку)**: няма

**Старонка музея на сайце ўстановы адукацыі (указаць спасылку):** https://sh15.goroo-orsha.by/об-учреждении/школьный-музей

**Старонка ў сацыяльных сетках (указаць спасылку):** няма

**Дата прысваення музею статусу “народны”:** няма

**Інфармацыя аб музеі:**

Асноўная ідэя выражана ў назве музея – “Аршаншчына літаратурная”. Беларусь шмат можа распаведаць аб сваіх літаратурных талентах. Памяць аб знакамітых пісьменніках і паэтах захоўваецца ў многіх мястэчках, з якімі ў розны час было звязана іх жыццё. Багата ў гэтым накірунку і наша аршанская зямля. Тут нарадзіліся такія знакамітыя ўсяму свету пісьменнікі і паэты, як Уладзімір Караткевіч, Уладзімір Корбан, Янка Сіпакоў, Юрый Багушэвіч і іншыя. У музеі праводзяцца аглядныя экскурсіі для вучняў 1-11 класаў школы, пешыя экскурсіі па г.Барані, арганізуюцца тэматычныя выставы, літаратурна-музычныя гасціныя, народныя святы, сустрэчы з літаратуразнаўцамі і дзеячамі мастацтва, класныя гадзіны і іншыя масавыя мерапрыемствы. У музеі праводзяцца ўрокі рускай і беларускай мовы і літаратуры, гісторыі. Музей дае магчымасць ажыццяўляць інтэграцыйныя сувязі паміж прадметамі: рускай і беларускай мовы і літаратуры з гісторыяй і геаграфіяй. У музеі праводзяцца наступныя тэматычныя экскурсіі: “Уладзімір Корбан – славуты зямляк”, “Спадчына Купалы”, “Пісьменніі і паэты Аршанскага рэгіёну”, “Яны змагаліся за Радзіму”. Кіраўнік музея – Чабанава Тэрэса Міхайлаўна.

**Кароткая характарыстыка музейных фондаў (што змяшчае ўвогуле, колькасць і г.д.):** Асноўны фонд уключае 127 музейных прадметаў: архіўныя дакументы, кнігі, бюст У.Корбану, часопісы, якія былі перададзены у музей пісацелямі-землякамі, або іх сваякамі і інш. Дапаможны фонд – 87 экспанатаў: копіі дакументаў, фотаздымкі, газеты.

**Найбольш каштоўныя музейныя прадметы (пералік з указаннем назвы, года вытворчасці/здабытку і г.д.):** Кніга “Мілавіца”. Вершы. Аўтар П. Саковіч, 2007/2009 г.; Кніга “Цар-царэвіч з Івацэвіч” Аўтар Л.Пранчак 2001/2009; Кніга “Лінія гарызонту”. Аўтар А.Лысенка 1986/1989; Часопіс “Вожык” №6 за сакавік 1968г./2015; Кніга “Свінні ў рэпе”. Байкі. Аўтар Ул. Корбан 1968/2000.

**Апісанне экспазіцый (назва экспазіцыі і яе апісанне):**

Цэнтральнае месца ў музеі займае экспазіцыя “Уладзімір Корбан – наш славуты зямляк”, дзе можна даведацца аб яго жыццёвым і творчым шляхах,

убачыць копіі фотаздымкаў, на якіх адлюстраваны Уладзімір Корбан у розныя гады жыцця.

У экспазіцыі "Янка Купала ў Ляўках" можна даведацца аб жыццёвым і творчым шляхах знакамітага класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. У экспазіцыі раздзела прадстаўлены фотаздымкі з сямейнага альбому, копіі вершаў паэта, зборнік вершаў "Алеся", кніга "Спадчына".

У экспазіцыі "Аршаншчына літаратурная" прадстаўлены матэрыялы аб такіх пісьменніках і паэтах Аршанскага рэгіёну як: У.Караткевіч, Ю.Багушэвіч, А.Міронаў, М.Садковіч, Я.Сіпакоў, А.Асіноўскі і інш.

Раздзел музея "Гісторыя Барані" распавядае аб прошлым і сучасным горада. Тут можна пазнаёміцца з сімволікай герба г. Барані, даведацца аб ваенных падзеях, якія праходзілі на тэрыторыі рэгіёну ў Сярэднявеччы; аб сучасным становішчы горада, яго эканоміцы, тапаніміікі, культуры.

Раздзел музея "Заўжды ў нашым сэрцы…" прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны на бараньскай зямлі.

**Узнагароды музея, кіраўніка музея, навучэнцаў-музейшчыкаў міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўняў (назва конкурса/акцыі, намінацыя, год, указанне дыплома са ступеню):**

Рэспубліканскі конкурс навуковых даследчых краязнаўчых работ навучэнцаў, намінацыя "Гісторыя роднага краю" – Дыплом I ступені Міністэраства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вучань Прынц Іван, 2021 г.

Рэспубліканскі конкурс "У каждого времени свои герои», номинация «Презентация» в рамках респ.декады гражданско-патриотических дел «Афганістан у лёсе нашых землякоў" – Дыплом III ступені Міністэраства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вучні: Байкоў Іван, Смарковіч Арына, 2021 г.

Рэспубліканскі конкурс "Лепшая метадычная распрацоўка музейнага занятку", намінацыя "Творчая знаходкі ў музеі" – Дыплом 3 ступені Міністэраства адукацыі Рэспублікі Беларусь (кіраўнік музея Баброва І.А.), 2021 г.

**Фотаздымкі музея:**
https://cloud.mail.ru/public/oQKu/d8aM8xhM5

**Дадатковыя матэрыялы:**

Відэаролік "Знакамітыя землякі-літаратары"
https://youtu.be/08QrNo4FiOQ